ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Выдаецца з 1 мая 1935 г.

1980 г. 31 студзеня чацвер № 3 (1267)

Выходзіць раз у тыдзень.

Цана 2 кап.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## НАВІНЫ БДУ

### У ПРАГРАМЕ СЕМІНАРА

вызваленых камсамольскіх работнікаў ВНУ і тэхнікумаў БССР, які зараз праходзіць у Ждановічах, — шырокі абмен вопытам работы, наведванне камітэтаў камсамола БДУ імя У. І. Леніна, БПІ, РТІ, інстытута замежных моў і інш.

На базе камітэта камсамола Белдзяржуніверсітэта адбудуцца практычныя занятკі па арганізацыі вучэбнай і навукова-даследчай работы студэнтаў.

Вельмі цікавая і культурная праграма семінара: выступленні агітбрыгады, сустрэчы з удзельнікамі клуба самадзейнай песні «Купалінка», творчым калектывам кафэ «Сузор'е».

### ЛЕПШЫХ ВЫНІКАЎ

у 1979 годзе ў выкананні ўмоў Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва сярод калектываў вышэйшых навучальных устаноў Мінвуза БССР за павышэнне эфектыўнасці вытворчасці і якасці работы, паспяховае выкананне заданняў дзесятай пяцігодкі дасягнулі калектывы Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга політэхнічнага інстытута, Беларускага тэхналагічнага інстытута.

### КАФЕДРАЙ ГЛЕБАЗНАЎСТВА

геаграфічнага факультэта БДУ імя У. І Леніна зараз праводзіцца сімпозіум па праблемах меліярацыі глеб.

Наш універсітэт і ўсе галіновыя навукова-даследчыя ўстановы, якія займаюцца пытаннямі меліярацыі, аддаюць вялікую ўвагу карэннаму паляпшэнню глебы нашай рэспублікі.

Асноўныя напрамкі навуковых даследаванняў: распрацоўка метадаў і спосабаў асушэння балот і забалочаных глебаў, рэгуляванне рэж-вадаёмаў, водабалансавых разлікаў меліярацыйных сістэм, меліярацыя сенажаці і пашы і інш.




Савецкія людзі рыхтуюцца адзначыць 110-ю гадавіну з дня нараджэння У. І. Леніна. Б'е ключом творчая ініцыятыва, разгортваецца спаборніцтва за тое, каб азнаменаваць фініш дзесятай пяцігодкі новымі працоўнымі перамогамі. Пертварыць 1980 год у год ударнай работы, работы па-ленінску — справа гонару кожнага калектыву. Аб тым, як сустракаюць ленінскі юбілей студэнты нашага універсітэта, чытайце на 2—3-й старонках.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

## Дзейснасць кіраўніцтва

Важную ролю ў пытаннях ідэйна-палітычнага, працоўнага і маральнага выхавання савецкага студэнцтва адыгрываюць камсамольскія арганізацыі. Іменна ад іх дзейнасці ў многім залежаць узровень падрыхтоўкі будучых спецыялістаў-выпускнікоў, іх ідэйная ўпэўненасць у барацьбе за камуністычныя ідэалы, высокая агульная культура, камуністычныя адносіны да працы, уменне працаваць з людзьмі.

Камсамольская арганізацыя факультэта прыкладной матэматыкі — адна з самых шматлікіх ва універсітэце. У састаў яе ўваходзіць прыкладна паўтары тысячы чалавек. У гэтым годзе для работы ў выбарных органах камсамола партбюро рэкамендавала 8 камуністаў.

Пытанні дзейнасці камсамола ўвесь час абмяркоўваюцца на пасяджэннях партыйнага бюро і партыйных сходах.

Дзейснай формай аналізу камсамольскай работы з'яўляюцца Ленінскі залік і грамадска-палітычная практыка. Гэтаму пытанню партыйнае бюро ўдзяляе пастаянную ўвагу. І на партсходах аналізуюцца ход і вынікі правядзення гэтага важнага мерапрыемства. Абмяркоўваючы ў лістападзе 1979 года ролю грамадскіх арганізацый у палітыка-выхаваўчай рабоце і аналізуючы работу камсамольскай арганізацыі, партыйнае бюро ўказала на фармальныя адносіны студэнтаў да грамадска-палітычнай атэстацыі і на зніжэнне актыўнасці камсамольцаў у грамадскай рабоце факультэта. Гэта сур'ёзна хвалюе камуністаў нашай арганізацыі. Зацвярджаючы новы састаў савета па ГПП (старшыня — член партбюро А. І. Мішук), партыйнае бюро паставіла шэраг задач па ліквідацыі адзначаных недахопаў: праводзіць ГПА на працягу семестра, збіраць звесткі аб грамадска-палітычнай рабоце студэнтаў у розных грамадскіх арганізацыях і агульную адзнаку выводзіць напярэдадні правядзення ГПА. Важным стымулам павышэння грамадскай актыўнасці з'яўляецца той факт, што ў гэтым годзе наш факультэт адзначае сваё дзесяцігоддзе.

Партыйнае бюро ўдзяляе ўвагу і працоўнаму выхаванню студэнтаў. Летнія працоўныя семестры аказваюць рознабаковы выхаваўчы эфект, спалучаючы ў сабе элементы працоўнага, палітычнага і маральнага выхавання. І гэта зразумела, бо будатрады праводзяць вялікую грамадска-палітычную работу. Практычна кожны баец атрада мае пастаяннае даручэнне. Арганізацыяй будаўнічых і сельгасатрадаў займаецца штаб працоўных спраў камітэта камсамола. У кастрычніку 1979 года партыйны сход абмяркоўваў работу партарганізацыі па працоўнаму выхаванню студэнтаў. Побач са станоўчымі фактарамі былі выяўлены шэраг недахопаў. Напрыклад, якасць фарміруемых атрадаў жадае быць лепшай, маладыя камуністы амаль не ўдзельнічаюць у кіраўніцтве СБА і г. д. Асаблівыя нараканні былі выказаны ў адрас штаба працоўных спраў па пытаннях фарміравання сельгасатрадаў. Намечаны шэраг мерапрыемстваў па ліквідацыі адзначаных недахопаў. Так, напрыклад, штаб працоўных спраў побач з фарміраваннем СБА ў сакавіку 1980 года павінен правесці фарміраванне сельгасатрадаў на базе 2—3 вучэбных груп, падабраць і зацвердзіць камандзіраў і камісараў сельгасатрадаў, арганізаваць іх вучобу і г. д.

Шмат увагі партыйнае бюро адводзіць пытанням прафарыентацыі школьнікаў. Тут хацелася б адзначыць актыўную работу «Школы юнага праграміста» (адказны М. Грамко). Большасць абітурыентаў, паступаючых на наш факультэт, прайшлі навучанне ў гэтай школе.

Набліжаецца 110-я гадавіна з дня нараджэння У. І. Леніна, і факультэт прыкладной матэматыкі рыхтуецца дастойна сустрэць гэту знамянальную дату.

**В. КРАСНАПРОШЫН,**
**сакратар партбюро ФПМ.**

## ЦІ ЛЮБІЦЕ ВЫ ТЭАТР?

Для тых хлопцаў і дзяўчат, якія займаюцца ў нашым універсітэцкім студэнцкім тэатры, пытанне гэтае ўжо вырашана. Яны літаральна «захварэлі» тэатральнай справай. Аддаюць ёй увесь свой вольны час, усе свае намаганні і пачуцці.

Наш тэатр — тэатр самадзейны. Усе, хто займаецца ў ім, безумоўна, не прафесіянальныя артысты, а звычайныя студэнты. Таму амаль кожны год акцёрская група тэатра мяняецца. На месца «ветэранаў» прыходзяць студэнты малодшых курсаў. Так пачаўся для нас і гэты год, калі ў тэатр прыйшло шмат першакурснікаў. Ім, пачаткоўцам, якія значна амаладзілі наш калектыў, і прыйдзецца ў будучым акрэсліць твар тэатра. Твар, па якім будзе ацэньвацца наша работа.

За час свайго існавання наш тэатр ператварыўся ў адзін з вядомых і папулярных самадзейных калектываў універсітэта.

Зараз мы працуем над двума цікавымі творамі — п'есай А. Валодзіна «Дзве стралы» і паэмай маладога беларускага паэта У. Някляева «Дарога дарог». І каб данесці да гледачоў асноўную думку гэтых твораў, прыйдзецца сутыкнуцца са шматлікімі цяжкасцямі, вырашыць пэўныя творчыя задачы. Але я ўпэўнена, што ўсе яны падуладны нам, бо галоўнай мэтай нашага універсітэцкага тэатра, як і любога самадзейнага калектыву, з'яўляецца непасрэдна сам творча-пазнавальны працэс, у якім з задавальненнем удзельнічаюць студэнты. Дарэчы, у нашым тэатры займаецца шмат выдатных студэнтаў-акцёраў. Гэта Пятро Марцаў і Эла Зінькова, Вольга Паўлоўская і Сяргей Мацкевіч, Лілія Левашвілі і Ірына Юркова, сёстры Дыяна і Жана Цімах і шмат іншых. Існуе і развіваецца творчая садружнасць са студэнцкім тэатрам Гомельскага універсітэта.

...Планаў шмат. І каб іх здзейсніць, нам патрэбна яшчэ многае зрабіць. І ў першую чаргу запрасіць да сябе усіх, хто па-сапраўднаму любіць тэатр, хто жадае знайсці ў ім шмат каштоўнага для сябе. І наш студэнцкі самадзейны тэатр з'яўляецца ў гэтым плане невычэрпнай крыніцай пошуку.

Прыходзьце ж да нас! Мы вас чакаем!

**Д. ТЫЦЮК,**
**памочнік рэжысёра студэнцкага тэатра.**

# ЛЕНІНСКАМУ ЮБІЛЕЮ —

**«110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна—ударную працу зімовага СБА»— пад такім дэвізам працавалі студэнты розных курсаў і факультэтаў універсітэта ў саставе камуністычнага будаўнічага атрада імя Ленінскага камсамола. Канікулы прайшлі на будаўнічых пляцоўках. Але аб гэтым ніхто з рабят не шкадуе. Колькі карыснага было зроблена, колькі цікавага даведаліся студэнты! Зноў працягваюцца заняткі, але ў памяці байцоў назаўсёды застануцца тыя дні, напоўненыя цікавымі сустрэчамі, мерапрыемствамі, сумеснай працай.**

# ЗВАРОТ

**СТУДЭНЦКАГА БУДАЎНІЧАГА АТРАДА ІМЯ ЛЕНІНСКАГА КАМСАМОЛА ДА СТУДЭНЦКІХ БУДАЎНІЧЫХ АТРАДАЎ УНІВЕРСІТЭТА, УСІХ СТУДЭНТАЎ**

Сёлета мы адзначым 110-ю гадавіну з дня нараджэння У. І. Леніна. Усе савецкія людзі працуюць пад дэвізам «Ленінскаму юбілею — ударную працу». Студэнцкая моладзь ніколі не была ў баку ад важнейшых грамадска-палітычных спраў. Пяцёркі ў залікоўках — добры падарунак ленінскаму юбілею.

Мы, байцы камуністычнага студэнцкага будаўнічага атрада імя Ленінскага камсамола, звяртаемся да камсамольцаў, юнакоў і дзяўчат універсітэта з заклікам адзначыць 1980 год выдатнымі поспехамі ў працы і вучобе, жыць, вучыцца і змагацца па-ленінску, па-камуністычнаму.

Сёлетні год — год алімпійскі. Наша Радзіма — першая сацыялістычная краіна, якая арганізуе Алімпіяду. Справа гонару савецкіх людзей зрабіць усё, каб спартыўны форум прайшоў на вышэйшым узроўні. Непасрэдны ўдзел у абслугоўванні алімпійскіх гульняў прыме і наш універсітэт. Зараз у поўным разгары рамонт інтэрнатаў, дзе будуць пражываць турысты і абслугоўваючы персанал. Зімовы студэнцкі будаўнічы атрад імя Ленінскага камсамола ўзяў шэфства над інтэрнатам № 7. Дні зімовых канікулаў байцы атрада правялі на алімпійскім аб'екце. Зроблена шмат. Ударным стаў кожны працоўны дзень.

Лектарская група атрада выступіла перад будаўнікамі з гутаркамі, лекцыямі аб БАМе і універсітэце. Агітбрыгада дала канцэрт.

Мы звяртаемся да ўсіх студэнцкіх будаўнічых атрадаў універсітэта ўзяць шэфства над алімпійскімі аб'ектамі. Падрыхтоўка да Алімпіяды-80—справа камсамольская. Арганізуем і правядзём на алімпійскіх аб'ектах суботнікі і нядзельнікі. Выступім перад рабочымі з лекцыямі і канцэртамі. Кожны баец СБА павінен унесці свой уклад у падрыхтоўку да маскоўскай Алімпіяды. Гэта будзе нашым канкрэтным адказам на зварот партыі азнаменаваць ленінскі юбілей ударнай працай.

**Зварот абмеркаваны і прыняты на агульным сходзе СБА імя Ленінскага камсамола.**

# Праверыць характар

АБ БАМе ведаюць усе. Пачатак будоўлі веку паклаў XVIII з'езд ВЛКСМ. Звяртаючыся да першага атрада савецкай моладзі, Л. І. Брэжнеў сказаў: «Мы цвёрда ўпэўнены, што камсамольцы, моладзь унясуць дастойны ўклад у гэту грандыёзную будоўлю. Эстафету Камсамольска-на-Амуры, Магніткі, Турксіба, Днепрагэса і цаліны, Брацка і КамАЗа яны пранясуць па новых, яшчэ не асвоеных прасторах Сібіры».

Вядома, не толькі людзі будуюць БАМ, але і БАМ — людзей, іх характары, уплывае на станаўленне асобы. Папасці на грандыёзную будоўлю — мара кожнага маладога чалавека. Сваімі рукамі ўзводзіць усенародную будоўлю—ці ж гэта не ганарова! Гераізм людзей, іх самаадданасць праяўляюцца не толькі на франтах вайны, але і ў мірны час, і БАМ — прамое пацвярджэнне гэтага.

Залічэнне ў СБА, які ўдзельнічае ў будаўніцтве БАМа, — справа гонару кожнага камсамольца.

Чаго хачу я — навічок атрада імя Ленінскага камсамола ад будучай паездкі на БАМ? Перш за ўсё выпрабаваць сябе праз працу. Выхаваць у сабе такія якасці, як мэтанакіраванасць, сіла волі. Праверыць свой характар, загартаваць сябе фізічна. Ведаю з расказаў старэйшых таварышаў, што БАМ — перш за ўсё работа, суровае выпрабаванне, свайго роду маральны і фізічны бар'ер для любога. Але ўяўленне недастаткова, трэба прайсці праз гэта, каб сказаць аб сабе без боязі памыліцца, што і ты чагосьці варты. Пазнаць цану сабе — гэта, на мой погляд, галоўнае, дзеля чаго імкнешся назваць сябе байцом бамаўскага атрада.

Ну і, вядома, такая знаёмая ўсім нам прага новага. Сваімі рукамі дакрануцца да БАМа, і не проста дакрануцца, а дапамагчы ў стварэнні яго, сваімі вачамі ўбачыць вынікі зробленага — вось мая мара. Магістраль ад Лены да Амура — гэта не толькі тысячы кіламетраў стальных дарог, не толькі новыя гарады і камунікацыі; гэта кароткі, але важкі радок у біяграфіі тысяч людзей, камсамольцаў перш за ўсё. Упісаць гэты радок, працоўны, гераічны — высакароднае імкненне кожнага маладога чалавека.

**П. ЦУНІК,**
**баец.**





**Працоўны дзень заканчваецца. Хутка апусцее будаўнічая пляцоўка. А вечарам, у інтэрнаце, брыгадзір атрада В. Мельнікаў падвядзе агульныя вынікі працы і сталасці, мужнасці і камсамольскага запалу байцоў, звычайных хлапцоў у форме СБА.**

# Кожны дзень— ударны

ЗАКОНЧЫЛАСЯ праца зімовага камуністычнага СБА. На будаўнічых пляцоўках, угрызаючыся ў мёрзлую зямлю лапатамі, у прасторных калідорах інтэрната № 7, на атрадных лінейках і сходах, у культпаходах і на рэпетыцыях агітбрыгады ні на хвіліну не замірала бурнае і захапляючае жыццё атрада. І цяпер яшчэ раз упэўніваешся ў тым, што калектыў не фарміруецца толькі з простай сумы індывідуальнасцей, а ствараецца ў пастаянных зносінах на рабоце і ў лагеры, у час адпачынку і на спартыўных мерапрыемствах, у працоўным спаборніцтве. Іменна так нараджаецца трывалы, дружны калектыў атрада.

Рабочы перыяд зімовага атрада вельмі малы. І напоўна таму кожны яго дзень так насычаны вялікімі і малымі падзеямі, якія надоўга застануцца ў нашай памяці.

Зімовым студэнцкім атрадам у гэтым годзе спаўняецца 5 гадоў. І хаця ўзрост гэтага напрамку ў студэнцкім будаўнічым руху «дашкольны», зімовы атрад ужо пацвердзіў сваю жыццяздольнасць і права на існаванне.

Як і пяць гадоў назад, наш атрад імя Ленінскага камсамола ўзняў сцяг зімовай працоўнай дэкады на будаўнічых пляцоўках горада Мінска. 45 юнакоў і дзяўчат у зялёных будатрадаўскіх формах актыўна ўзяліся за даручаную ім камітэтам камсамола універсітэта справу — падрыхтоўку да будаўнічых работ і абсталяванне маладзёжнага кафэ, падрыхтоўку інтэрната № 7 да Алімпіяды-80.

З першых дзён тон у рабоце задавалі ветэраны студэнцкіх будоўляў Міхаіл Карабейнік, Васіль Аўдзеенка, Уладзімір Прушак. Яны наперадзе не толькі ў час працы, а і ў правядзенні грамадска-палітычных мерапрыемстваў.

Кожны дзень, кожны час, кожная хвіліна работы атрада былі запоўнены грамадска-карыснай справай. За гэты час лектарскай групай прачытана 5 лекцый (за падрыхтоўчы перыяд — 24). У інтэрнаце № 7 з канцэртам для рабочых выступіла агітбрыгада атрада. Культпаходы ў кіно, экскурсія ў музей, удзел ва Усесаюзнай турысцкай экспедыцыі «Мая Радзіма — СССР», вечар палітычнага плаката, сустрэча з прадстаўнікамі турклуба універсітэта — вось далёка не поўны пералік падзей жыцця атрада.

26 студзеня быў праведзены вечар, прысвечаны гісторыі атрада, гісторыі зімовых СБА краіны. Успаміны ветэранаў, дэманстрацыя слайдаў, атрадныя песні, выступленні байцоў — усё гэта наблізіла нас да падзей тых гадоў, дазволіла адчуць сябе ўдзельнікамі тых будоўляў і ў сваю чаргу абавязала байцоў атрада прадоўжыць слаўныя шляхі СБА імя Ленінскага камсамола.

Зімовы атрад закончыў сваю работу, але падрыхтоўка да летняга перыяду не спыняецца. Студэнты будуць працягваць пачатую справу, будуць імкнуцца стаць дастойнымі байцамі СБА імя Ленінскага камсамола.

**С. БАРАНАЎ,**
**камісар.**

# ДАСТОЙНУЮ СУСТРЭЧУ!



## НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

# ВЫТОКІ ТРАДЫЦЫІ

ЗІМОВЫ студэнцкі будатрад. У студзені гэтага года яму споўнілася 5 гадоў. І цяперашні камуністычны СБА імя Ленінскага камсамола працягвае традыцыі таго атрада, які зімой 1975 года ўпершыню ў гісторыі універсітэта пачаў свой працоўны семестр у час зімовых канікулаў. Сёння на пытанні карэспандэнта «Беларускага універсітэта» адказвае сакратар Маскоўскага райкома камсамола горада Мінска Генадзь Дзмітрыевіч Хухлындзін, брыгадзір першага зімовага СБА.

**Карэспандэнт: Цікава даведацца, чаму раптам студэнты вырашылі пачаць свой працоўны семестр, парушыўшы традыцыю: не летам, а зімою? І якую задачу яны перад сабой ставілі?**

**Генадзь Хухлындзін:** Цяпер нават цяжка ўспомніць, хто першы падаў ідэю. Яна даўно ўжо вітала, як кажуць, у паветры. Арганізуючы гэты будатрад, мы былі далёкія ад думкі ставіць працоўныя рэкорды, чымсьці незвычайным звярнуць на сябе ўвагу. Усё было прасцей. Студэнцкі будаўнічы рух набыў вялікі размах. І не лічыцца з ім было проста неразумна. Але ўзнікае такое пытанне. Хто едзе ў атрады? Ну, вядома, студэнты. А хто імі кіруе, арганізуе працоўны працэс, хто праводзіць палітыка-выхаваўчую работу? Адказ ясны — камандзір, брыгадзір і камісар. І ўсе пералічаныя асобы таксама студэнты. А іх спецыяльна не вучылі таму, каб яны з поўнай адказнасцю і ўсведамленнем за даручаную справу адпавядалі прызначэнню. І вось першачарговая задача, якую ставіў перад сабой атрад, — прывіць байцам навыкі работы ў будатрадах. Карацей кажучы, нам трэба было зрабіць з кожнага байца зімовага атрада камандзіра, камісара, брыгадзіра для работы ў час летніх канікулаў...

**Карэспандэнт: Мякка кажучы, у апошняе мала верыцца. Няўжо ўсе байцы так і паехалі кіраўнікамі ў атрады?**

**Генадзь Хухлындзін:** Безумоўна, не. Гэта была, так сказаць, праграма-максімум. Але прыемна канстатаваць той факт, што большасць байцоў атрада на самай справе сталі камандзірамі, камісарамі, брыгадзірамі.

**Карэспандэнт: На Ваш погляд, якое адрозненне зімовага СБА ад летняга?**

**Генадзь Хухлындзін:** Часткова я адказаў ужо на гэта пытанне. Асноўнае адрозненне — гэта адсутнасць падрыхтоўчага перыяду. Адразу з універсітэта — на будоўлю. А гэта якраз і абумоўлівае асабовы састаў атрада. Студэнты у нейкай меры павінны быць знаёмы з будатрадаўскай справай. Я паўтараю, мы не бралі за мэту ставіць рэкорды, хаця і працавалі ніколькі не горш, чым летам. Школа выхавання, час для прыціркі і знаёмства байцоў — вось для чаго патрэбен будатрад. Зімовы — гэта як бы мініаналог летняга СБА. Самым характэрным у нашым атрадзе была ўзаемавыручка. Сумаваць не было калі. Над гэтым нават не задумваліся. У канцы працы стала ўсім зразумела — калі б адправіць увесь атрад у такім саставе на будоўлю, мы былі б па-за канкурэнцыяй. Зімовы — як лакмусавая паперка — паказаў, на што здольны кожны баец атрада.

**Карэспандэнт: Міжволі ўзнікае пытанне. А як жа быць з адпачынкам студэнтаў? Сесія, атрад, заняткі зноў да наступнай сесіі. Калі ж развеяцца ад вузаўскіх турбот, адпачыць ад духаты чытальных залаў, прыйсці ў сябе ад стрэсаў у час экзаменаў...**

**Генадзь Хухлындзін:** Гм... А назавіце мне ці пакажыце хоць аднаго студэнта, які б пасля летняга будатрада адчуваў сябе дрэнна адпачыўшым. Думаю, такога не знойдзецца. Тое самае і зімовы атрад. Хлопцы ўзмужнелі, налілася сілай мускулатура. Пасля працы — цікавыя і змястоўныя мерапрыемствы. Чым кепска? Няма патрэбы аспрэчваць факт, што такі адпачынак куды цікавей і карысней, чым «адсыпанне» цэлымі днямі ад сесіі. А той, хто думае інакш — проста не мае рацыі. Як працаваць, так і адпачываць трэба ўмець.

**Карэспандэнт: З дня арганізацыі першага зімовага атрада прайшло даволі шмат часу. Ужо паявіліся падобныя атрады не толькі ва універсітэце, але і ў іншых вузах...**

**Генадзь Хухлындзін:** І яны будуць. Зімоваму будатраду, упэўнены, гарантавана доўгае жыццё.

**М. ДУБОВІК,**
**наш кар.**

## БАЙЦЫ ЎСПАМІНАЮЦЬ

# ДРУЖБЕ МАЦНЕЦЬ

МНОГІЯ мараць папрацаваць у СБА, стаць сапраўдным байцом-будаўніком. Але гэта не проста, не кожны з гэтым справіцца. Быць байцом — значыць трэба мець сілу волі і цвёрды характар, імкненне да невядомага, новага, цяжкага. Гэтыя рысы набываюцца і выпрацоўваюцца ўвесь час, а не адразу. Гэта я ведаю па сабе і па вопыту маіх сяброў, якія ўжо некалькі разоў працавалі ў СБА. Наш атрад імя Ленінскага камсамола адным з першых у БДУ пачаў сваю працоўную біяграфію. Я кажу: наш атрад, і ўпэўнены, што так скажа кожны, хто працаваў у СБА імя Ленінскага камсамола. Наш таму, што мы вельмі пасябравалі за час работы; наш таму, што мы першыя паклалі пачатак зімовым СБА, і яшчэ таму, што мы заўсёды былі студэнтамі, усмешка і маладзецкі запал усюды былі з намі.

У СБА імя Ленінскага камсамола асаблівая атмасфера, дзелавая і цікавая, гэта адчувалася адразу.

Працавалі ў Нясвіжскім раёне, у калгасе. Будавалі буйны сельскагаспадарчы комплекс. Атрад тады называўся «Таварыш-78». Працавалі з сябрамі з ГДР. Наш атрад даўно падтрымлівае сяброўскія сувязі з Іенскім універсітэтам. Было вельмі цудоўна: і цяжкія бетонныя работы, і халодныя дажджы, і ўборка сена ў калгасе, і сумесныя канцэрты перад калгаснікамі і рабочымі...

Зімой 1979 года СБА імя Ленінскага камсамола працаваў на алімпійскім аб'екце — стадыёне «Дынама», дапамагаў у будаўніцтве аднаго з заводаў. Калектыў здружыўся і арганізаваўся адразу дзякуючы дакладнай і рытмічнай рабоце штаба.

Ігар Велічанскі быў нашым камісарам. Першы раз у СБА, але паважалі яго рабяты за разумную ініцыятыву і дзелавітасць. Сфарміраваўся касцяк атрада ў час работы зімой. Мароз і холад — таксама добрае выпрабаванне. Вось і лета. Едзем на БАМ, але гэтаму папярэднічалі бяссонныя ночы штаба, канкрэтная дзейнасць усяго калектыву: лекцыі, збор кніг для бібліятэкі, афармленне будучага таёжнага лагера і г. д.

Тайга. Пасёлак Сярэбраны Бор. У асноўным займаліся бетоннымі работамі. Цяжка? Нялёгка... Застываюць бетонныя дарогі ў тайзе, застываюць у бетоне кроплі нашага поту, і мацнее наша дружба. Два месяцы праляцелі ў напружанай і цікавай рабоце неяк непрыкметна. Ад'язджаць не хацелася, не верылася, што гэта пабудавана нашымі рукамі. І што пара ляцець дадому, вяртацца да гарадской мітусні. За плячыма кіламетры дарог, пабудаваных намі, склады і рамонтная майстэрня, аўтакалона і гаражы, 17 тысяч кніг, якія падарылі пасёлку, лекцыі і канцэрты перад будаўнікамі БАМа. І вядома ж, новыя сябры, якія памятаюць нас і якім мы шлём пісьмы. Там, у Паўднёвай Якуціі, пад снегам і сцюжамі—бетон, пакладзены нашымі рукамі. І таму многіх цягне ў старыя месцы, у тайгу. Хочацца пабудаваць для людзей яшчэ нешта патрэбнае і карыснае.

У іншых атрадах яшчэ расказваюць аб прайшоўшым леце, а ў нас ужо фарміруецца новы калектыў, ідзе інтэнсіўная падрыхтоўчая работа да новага працоўнага семестра. Кожны год нешта новае і хвалюючае чакае цябе. Без жалю і з нейкай урачыстасцю прыступаеш да ўкамплектавання рукзака перад дальняй дарогай: джынсы і модныя чаравікі мяняеш на камбінезон і гумавыя боты. Зноў чыстае таёжнае паветра. Наліваюцца нашы спіны і рукі сілай, мацнее наша дружба, зноў нам людзі гавораць: «Шчырае дзякуй».

**У. ДЗЮБА,**
**баец.**

**Ганаровым байцом студэнцкага будаўнічага атрада імя Ленінскага камсамола залічаны лётчык-касманаўт СССР, Герой Савецкага Саюза Уладзімір Васільевіч Кавалёнак.**

**НА ЗДЫМКУ: байцы СБА імя Ленінскага камсамола на радзіме касманаўта.**



## АМАЛЬ СУР'ЁЗНА

# РАБОТА ТАКАЯ...

РАНІЦА на дзіва марозная. Толькі-толькі развіднела, а брыгада, узначальваемая Васілём Аўдзеенкам, ужо была на рабочым месцы. Сцюжа такая, што страшна выйсці з бытоўкі. Але брыгадзір, ніжэй апусціўшы «вушы» шапкі, адважна кідаецца насустрач марозу і калючаму снегу. За хлопцам ідзе ўся брыгада. Пачаўся працоўны дзень. Казалі, што тут, дзе зараз працуе брыгада, восенню з-за гразюкі прайсці нельга. Гумавыя боты былі самым лепшым абуткам. А цяпер зямля цвёрдай стала, як бетон. Першачарговая задача—падрыхтоўка грунту пад заліўку фундамента. Работа хлопцам выпала адказная і, трэба сказаць, нялёгкая. Гэта ж не жартачкі—дзяўбаць ломам акамянеўшыя гліну і пясок. Але трэба. І, разумеючы адказнасць справы, ускладзенай на іх, будатрадаўцы працуюць шчыра, самааддана, не шкадуючы сіл.

Даволі звыклая з'ява, якая часта назіраецца ў будатрадах—студэнты сваёй ударнай працай заўсёды здзіўляюць рабочых. Не было выключэння і на гэты раз. Рабочыя сядзелі ля цяпельца, грэлі рукі і бакі, раз-пораз прыгаварвалі:

— Во даюць студэнцікі...

— Небаракі... — паспачуваў другі будаўнік, паварочваючыся спіной да вогнішча.

А студэнты грэліся пры дапамозе рыдлёвак і ломаў. Тут і вопратку хоць здымай, дзяўбаючы гэты граніт. Удар ломам — кавалачкі зямлі, бы асколкі шкла, разлятаюцца навокал. Удар, яшчэ раз... Літаральна па сантыметру паглыбляецца яміна. З нейкай нават апантанасцю працуе рыдлёўкай Мікола Бабій. Можна падумаць, што ён, як і Леанід Пранчак і Міша Карабейнік, усё жыццё і меў толькі справу з будаўніцтвам, а не займаўся ва універсітэце. Гэтыя хлопцы і задаюць, як кажуць, тон у рабоце.

Важна ходзіць па пляцоўцы прараб. Паціскае рукі. Толькі невядома чаго—ці ад марозу, ці ад задаволенасці працай студэнтаў. А яны працуюць. Добра. Ударна. Як заўжды. З юнацкім запалам і аптымізмам. І не без жартаў. Здаецца, без іх было б куды халадней. І ад задавальнення ад выкананай работы, яўна напрошваючыся на камплімент, адзін са студэнтаў пытаецца ў начальніка-прараба:

— І што б вы рабілі без нас? Прапалі б, мабыць?

А прараб даволі спакойна адказвае:

— Чаго б гэта мы прапалі? Не... Выклікаў бы трактар і— уся работа.

Студэнты, збітыя з панталыку гэтымі словамі, на нейкае імгненне спынілі работу. Пераглянуліся. І раптам дружна засмяяліся. «Гэта ж трэба... Ну і жартаўнік у нас прараб...»

Але, здаецца, сапраўды крыху цяплей стала ад смеху. Пасмяяліся — і зноў за работу. Лапаты, ламы так і мільгаюць у руках.

Удар. Яшчэ адзін. Удар...

**Д. МІКАЛАЕЎ.**

**ЯК ЖЫВЕШ, НАСЦЕНКА?**

# Кантрасты адносін

НАСЦЕННЫ друк — гэта голас грамадскасці, баявы памочнік партыйнай і прафсаюзнай арганізацый. Уяўленне аб добрым насценным друку хутчэй за ўсё звязана з такімі яго якасцямі, як канкрэтнасць, дзелавітасць, прынцыповасць. Кожны нумар насценнага друку — гэта вынік калектыўнай творчасці. І ад таго, з якім жаданнем, энергіяй, настойлівасцю працуюць члены рэдкалегіі над сваёй газетай, залежыць іх канчатковы вынік. Выпуск цікавай газеты — справа, якая патрабуе душэўнага гарэння, адказнасці, зацікаўленасці.

Нам здаецца, што ўсім гэтым патрабаванням адпавядае насценная газета «Віта» біялагічнага факультэта. Яе рэдактар Людміла Кніга і ўвесь калектыў рэдкалегіі працуюць над газетай з поўнай аддачай сіл, стараюцца зрабіць кожны нумар цікавым і змястоўным.

Ні адзін нумар не выходзіць без матэрыялаў, прысвечаных праблемам навучальна-выхаваўчай работы. Навучальна-выхаваўчы працэс — вядучы напрамак дзейнасці рэдкалегіі калектыву і факультэта ў цэлым. Аб гэтым гавораць настутныя рубрыкі: «Справы камсамольскія», «Са сходу», «Творчасць біёлагаў», «Інтэрнат», «Біяфак спартыўны», «Нашы юбіляры» і многія іншыя, якія адлюстроўваюць актуальныя праблемы жыцця калектыву.

За мінулы год у сацыялістычным спаборніцтве газета біялагічнага факультэта заняла першае месца ва універсітэце. І сёлета рэдакцыйны калектыў так арганізаваў работу, што амаль у кожным нумары друкуецца праблемны матэрыял. Аўтарамі з'яўляюцца выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты. Гэта ажыўляе газету, робіць яе рознабаковай, цікавай. Праблемы ўзнімаюцца самыя разнастайныя. «Адкінем фармалізм» — пад такім загалоўкам быў надрукаваны матэрыял аб павярхоўным падыходзе да грамадска-палітычнай атэстацыі. Выступленне выклікала шырокую дыскусію сярод студэнтаў. Не застаўся без увагі і матэрыял «Давайце жыць весела» — аб праблемах студэнцкага адпачынку. Не дае спакойна жыць «Віта» адстаючым студэнтам, якія цягнуць факультэт назад, маюць акадэмічныя запазычанасці, парушаюць вучэбную дысцыпліну. Аб недахопах у шэфскай рабоце таксама не раз выступала «Віта».

Шырокі дыяпазон жанраў газеты — артыкулы, заметкі, інтэрв'ю, рэйды і г. д. Нярэдка «Віта» друкуе і калектыўныя матэрыялы, такія, як «Наш куратар», аўтары якога — студэнты-біяхімікі 5-га курса — расказваюць аб сваім куратару. Вялікай папулярнасцю карыстаецца рубрыка «Творчасць біёлагаў».

У чым сакрэт поспеху газеты?

— Па-першае, — расказвае член рэдкалегіі Сяргей Войт, — патрэба выказаць удзячнасць яе рэдактару Людміле Кнізе, якая здолела згуртаваць рэдакцыйны калектыў, запаліць у кожным агеньчык пошуку. Па-другое, над кожным нумарам і матэрыялам газеты вядзецца вялікая і карпатлівая праца. Перш чым кафедра ці карэспандэнт атрымае заданне, дасканала распрацоўваюцца пытанні, на якіх аўтар павінен сканцэнтраваць галоўную ўвагу. Гэта дае магчымасць значна палепшыць якасць матэрыялаў.

Значнае месца ў нашай газеце займае мастацкае афармленне, шматлікія матэрыялы дапаўняюць фотаздымкі.

Зусім іншае ўражанне, у параўнанні з «Вітай», пакідае газета «Хімік» хімічнага факультэта. Тут змяшчаюцца матэрыялы больш агульнага характару, яны не маюць канкрэтнага адрасата.

Можа хімфак не мае творчай, ініцыятыўнай моладзі? Не, гэтага нельга сказаць, калі ўлічыць, на якім высокім узроўні праводзяцца на факультэце дні хіміка. Тут знаходзяцца і свае празаікі, паэты, гумарысты. А вось у газеце іх слова пакуль што не чуваць. І таму орган партбюро, дэканата, камітэта камсамола і прафсаюзнага бюро выглядае, мякка кажучы, бясколерным, бездапаможным. На справаздачна-выбарным камсамольскім сходзе сакратар камітэта камсамола хімфака С. Рахманаў гэтыя праблемы ўзнімаў. Але і пасля ні ў адным нумары «Хіміка» не паявіліся праблемныя матэрыялы. Не вызначаецца належным узроўнем і эстэтычны выгляд газеты. Як правіла, матэрыялы друкуюцца на поўных машынапісных лістах паперы, што стварае цяжкасці пры чытанні. Мастацкае афармленне некаторых нумароў «Хіміка» таксама жадае быць лепшым.

Вузкае кола і аўтарскага актыву «Хіміка», бо газета не карыстаецца папулярнасцю сярод студэнтаў. І ўсё гэта ляжыць на сумленні рэдакцыйнай калегіі (састаў якой 20 чалавек) на чале з яе рэдактарам Ю. Р. Орлікам. А хімікам ёсць у каго пераняць вопыт, тым больш, што з біёлагамі яны знаходзяцца ў адным будынку.

Хочацца выказаць упэўненасць, што хімічны факультэт знойдзе агульную мову з біялагічным, і насценная газета «Хімік» будзе адпавядаць надзённым патрабаванням часу.

**В. ШАЎЧУК.**
наш кар.

# УВАГА: КОНКУРС!

Студэнцкія будаўнічыя атрады універсітэта карыстаюцца заслужанай павагай. Зводны СБА БДУ імя У. І. Леніна стаў пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва 1979 года на лепшы зводны СБА ў рэспубліцы. У гісторыі будаўнічых атрадаў універсітэта шмат яркіх старонак. З мэтай іх далейшай прапаганды рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» сумесна са штабам працоўных спраў аб'яўляе конкурс на лепшы фотаздымак аб СБА.

**Фотаздымкі на конкурс прымаюцца да 20 лютага. Пераможцаў конкурсу чакаюць каштоўныя падарункі. Галоўны прыз — фотаапарат.**

Лепшыя здымкі будуць апублікаваны ў газеце «Беларускі універсітэт».

**● ЦІКАВА ВЕДАЦЬ**

# ЗАПРАШАЕМ НАВЕДАЦЬ

З ПЕРШЫХ дзён Савецкай улады ў галіне культурнага будаўніцтва перад маладой сацыялістычнай дзяржавай стаяла грандыёзная задача: авалодаць культурнай спадчынай мінулага, ператварыць усе прагрэсіўныя дасягненні культуры, усе матэрыяльныя і духоўныя каштоўнасці ў агульнанароднае дасягненне.

Да ліку значных культурных каштоўнасцей, якія засталіся нам ад мінулых пакаленняў, належаць кнігі, якія з'яўляюцца помнікамі айчыннай і сусветнай культуры, увасабленнем гістарычных дасягненняў чалавечага розуму.

Аддзел рэдкіх і каштоўных кніг бібліятэкі Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна малады. Ён арганізаваны да 60-годдзя Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Тут захоўваецца найбольш каштоўная частка фонду. Гэта частка фонду садзейнічае актывізацыі выкарыстання кніжных багаццяў для развіцця даследаванняў у галіне гісторыі рэвалюцыйнага руху, гісторыі навукі, гісторыі кнігі. Аддзел з'яўляецца вучэбнай базай гістфака, журфака, філфака, шырока выкарыстоўваецца для правядзення экскурсій.

У гады акупацыі Беларусі бібліятэка амаль поўнасцю была знішчана, найбольш каштоўныя кнігі вывезены у Германію. Засталося толькі некалькі тысяч разрозненых выданняў. Дзякуючы намаганням супрацоўнікаў бібліятэкі ўдалося зберагчы вельмі нязначную частку кніжнага фонду. Вялікую дапамогу ў пасляваенныя гады аказалі бібліятэцы МДУ, ЛДУ, Маскоўскі педагагічны інстытут імя К. Лібкнехта, Дзяржфонд літаратуры.

Самая старая кніга ў нашым фондзе — «Арыфметыка» Л. Магніцкага 1703 года. Гэта кніга ўяўляе сабой энцыклапедыю ведаў у галіне арыфметыкі, алгебры, геаметрыі і трыганаметрыі. У ёй упершыню прымяняліся арабскія лічбы.

Сярод выданняў Акадэміі навук другой палавіны XVIII стагоддзя значную каштоўнасць уяўляюць гістарычныя работы. Асабліва публікацыі першакрыніц, напрыклад, летапісаў, творы па старонках рукапісных спісаў.

Захаваліся кнігі па розных галінах ведаў: псіхалогіі, этыцы, эстэтыцы, філасофіі, гісторыі рэлігіі, па прыродазнаўчых навуках і гістарычных.

Фонд аддзела папаўняецца не толькі дарэвалюцыйнымі рэдкімі выданнямі, але і сучаснымі факсімільнымі і арыгінальнымі ў паліграфічным афармленні.

Адна з асноўных задач аддзела — выяўленне рэдкіх і каштоўных выданняў з фондаў бібліятэкі БДУ і дакамплектаванне з іншых крыніц.

**А. СІНЬКЕВІЧ,**
**загадчык аддзела рэдкіх і каштоўных кніг.**



**На гэты раз гасцямі алімпійскай зборнай СССР па фехтаванню, якая праводзіла чарговы збор у Стайках, быў тэатр мініяцюр факультэта прыкладной матэматыкі БДУ імя У. І. Леніна.**

**Пераможцы мінулагодняга універсітэцкага конкурсу. Іх выступленні мелі поспех не толькі сярод студэнтаў універсітэта. Яны падабаліся ўсім, каму хоць аднойчы давялося сустрэцца з гэтым цудоўным калектывам.**

**Зараз жа іх гледачамі былі спартсмены. Перад імі рабяты выступілі са сваёй новай праграмай, якую падрыхтавалі да 10-годдзя стварэння факультэта. І зноў сустрэча прайшла ў цёплых абставінах.**

**У заключэнне неаднаразовая алімпійская чэмпіёнка Алека Бялова падзякавала ўдзельнікам тэатра за цікавае прадстаўленне і пажадала калектыву новых творчых поспехаў.**

**НА ЗДЫМКАХ: вядомыя савецкія спартсмены-фехтавальшчыкі Алена БЯЛОВА, Аляксандр і Уладзімір РАМАНЬКОВЫ і іншыя разам з удзельнікамі тэатра.**

**В. МАЛЮГІН.**
**Фота М. Сігневіча.**



# ГАЗЕТА ВЫСТУПІЛА. ШТО ЗРОБЛЕНА?

«У ВАШАЙ газеце ад 29.12.79 года быў надрукаваны артыкул «Пара біць трывогу». У сувязі з гэтым аддзелам трэста зроблена паўторная праверка работы сталовай НДІ ПФП пры БДУ.

Факты, адзначаныя ў артыкуле, сапраўды мелі месца.

Былі прыняты адпаведныя меры па ліквідацыі недахопаў у рабоце сталовай. Сумесна з тэхнолагам трэста складзена прыкладнае меню на тыдзень з улікам прадуктаў, якія будуць паступаць. Адрэгулявана пытанне рэжыму работы сталовай.

На машыну ММТУ-500, якая прызначана для мыцця посуду, «Белгандальтэхнікай» выдадзены акт на спісанне.

У бліжэйшы час машына будзе дэманціравана. Устанавіць больш магутную машыну з-за адсутнасці адпаведных вытворчых пляцовак пакуль няма магчымасці.

Касавы апарат будзе заменены пасля паступлення адпаведнага фонду ў трэст.

У сталовай таксама адрамантаваны халадзільная камера і халадзільнае абсталяванне буфета. Заменена мыечная ракавіна цэха халодных закусак, каналізацыя. Часткова абноўлены іншы інвентар.

Сталовую правярала камісія грамадскага харчавання ў саставе В. В. Страленкі, В. А. Тарасевіча, В. Л. Пачачуева. У акце адзначана, што санітарны рэжым сталовай добры. Заўваг па рабоце сталовай зараз няма.

Работа сталовай НДІ ПФП узята пад кантроль вытворчага аддзела трэста».

**Л. ТРУШЫНА,**
**в. а. дырэктара трэста сталовых Кастрычніцкага раёна горада Мінска.**


**БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ**

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

31 СТУДЗЕНЯ 1980 г.

Заказ 152. АТ 15045

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 22-07-19

**В. а. рэдактара**
**В. П. ВАРАБ'ЁЎ**